# Падляшскі беларускі спеўнік



II LICEUM OGÓLNOKSZTAŁCĄCE Z DODATKOWĄ NAUKĄ JĘZYKA BIAŁORUSKIEGO W HAJNÓWCE

II АГУЛЬНААДУКАЦЫЙНЫ ЛІЦЭЙ З ДАДАТКОВЫМ НАВУЧАННЕМ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ Ў ГАЙНАЎЦЫ

Гэтая публікацыя была створана ў рамках праекта „Нацыянальныя меншасці багацце Еўропы”,
які рэалізуецца ў рамках праграмы „Эразмус +”, дзеянне 2 Школьнае супрацоўніцтва.

Niniejsza publikacja powstała w ramach projektu
„Mniejszości narodowe bogactwem Europy”
realizowanego w ramach programu Erasmus+ Akcja 2 Partnerstwa Współpracy Szkół.

This publication was created as part of the project „National minorities - treasure of Europe” implemented under the Erasmus + Program Key Action 2 School
Cooperation Partnerships.

Публікацыя адлюстроўвае толькі пазіцыю яе аўтараў, і Еўрапейская камісія і Нацыянальнае агенцтва праграмы Erasmus + не нясуць адказнасці за яе змястоўны змест.

БЯСПЛАТНАЯ ПУБЛІКАЦЫЯ

Publikacja odzwierciedla jedynie stanowisko jej autorów i Komisja Europejska oraz Narodowa Agencja Programu Erasmus+ nie ponoszą odpowiedzialności za jej zawartość merytoryczną.

PUBLIKACJA BEZPŁATNA

This publication reflects the views only of the authors and the European Commission and the National Agency of the Erasmus + Programme cannot be held responsible for any use which may be made of the information contained therein.

FREE PUBLICATION

# Змест

3. Ой за гаем гаем
4. Летев бусёл чэрэз вуліцю
4. Ой пад мостам мостам
6. Чэрэз нашэ сельце
8. Чараўніца
9. Люблю...
10. Беларусачка
11. Цячэ вада ў ярок
12. Гарэла сосна, палала
14. Касіў Ясь канюшыну
15. Колькі ў небе зор
16. Ой, ляцел гусі з броду
17. Толькі з табою
18. Ты казала ў панядзелак
22. Вы шуміце, бярозы
23. Вяне рута
24. Несе Галя воду
25. Рэчанька
26. Палюбіла я яго
27. Туман ярам
28. Пагоня
29. Купалінка
30. Бывайце здаровы
32. Ой, у лузе пры даліне

**Ой за гаем гаем**
Гаем зелененькім
Там орала дзіучынонька
Воліком чорнэнькім

Орала орала
Не умела ораці
Той наняла козачэнька
На скрыпонці граці

Козачэнько грае
Очкамі моргае
Ліхо цябе бацко знае
На кого моргае

Чы на мое волы
Чы на мое коні
Чы на мое беле лічко
Чы на чорны бровы

**Летев бусёл чэрэз вуліцю**
Схватів Жэню за потыліцю
Тягав тягав, волочыв волочыв
Покуоль дожджык нэ змочыв
А Володька той бежыт крычыт
Оддай мою тай роботнічку
Возмі собе нэ охыднічку

**Ой пад мостам мостам**
Там павонька з хвостам
Каліна маліна
Там павонька з хвостам

Павонька хадзіла
Перечкі губіла
Каліна маліна
Перечкі губіла

Марыся хадзіла
Перечкі збірала
Каліна маліна
Перечкі збірала

Перечкі збірала
У хвартушак клала
Каліна маліна
У хвартушак клала

А з хвартушка брала
У падушэчкі клала
Каліна маліна
У падушэчкі клала

З падушэчак брала
Беле ложэ слала
Каліна маліна
Беле ложэ слала

Ой ты ложэ ложэ
Хто на тобе ляжэ
Каліна маліна
Хто на тобе ляжэ

Месяц із зарою
Хлопец з дзяўчыною
Каліна маліна
Хлопец з дзяўчыною

**Чэрэз нашэ сельце**
Все вэзут дэрэвце
Гэй-гэй, все вэзут дэрэвце

А з того дэрэвця
Цэрквочку будуют
Гэй-гэй, цэрквочку будуют

З сэрэдіны пішут
А з вэрху малуют
Гэй-гэй, а з вэрху малуют

Малёвалі воны
Тры месяцы ясны
Гэй-гэй, тры месяцы ясны
Тры месяцы ясны
Тры зоркі прэкрасны
Гэй-гэй, тры зоркі прэкрасны

Пэрша зорка ясна
Гандзечка прэкрасна
Гэй-гэй, Гандзечка прэкрасна

Друга зорка ясна
Касенька прэкрасна
Гэй-гэй, Касенька прэкрасна

Трэтя зорка ясна
Манечка прэкрасна
Гэй-гэй, Манечка прэкрасна

Пэршы месэць ясны
Колечка прэкрасны
Гэй-гэй, Колечка прэкрасны

Другі месэць ясны
Яшэчка прэкрасны
Гэй-гэй, Яшэчка прэкрасны

Трэті месэць ясны
Іванко прэкрасны
Гэй-гэй, Іванко прэкрасны

**Чараўніца**

Ля крыніцы толькі шумяць чараты
Доўга я чакала, любы не прыходзіў ты.
Не прыходзіў ты, бо не ведаў, не гадаў
Бо спаткання ля крыніцы мне не прызначаў.

Ты мяне над крыніцаю
Называў чараўніцаю
Я цябе зачаравала варажбой
А сама зачараваная табой

Можа ты не мной, чараўніцай другой
Загавораны таемна і прыгавор травой
Буду варажыць, ці ждарлабіць ці гадаць
Раскахаў ты, ці кахаеш, дзе цябе чакаць

Прыпеў ...

На ўсёй зямлі, мы з табой адны
Праплывуць над чаратамі белы туманы
І каханне зноў прывядзе цябе сюды
Да крыніцы, да паленнай, да жывой вады

**Люблю...**

Люблю наш край, старонку гэту,
Дзе я радзілася, расла,
Дзе першы раз пазнала шчасце,
Слязу нядолі праліла.

Люблю народ наш беларускі,
Іх хаты ў зелені садоў,
Залочаныя збожжам нівы,
Шум нашых гаяў і лясоў.

І рэчку, што імкліва воды
Імчыць ў нязведаную даль,
І схілы берагоў пясчаных,
І яснасць чыстых яе хваль.

І песню родную люблю я,
Што дзеўкі ў полі запяюць,
А тоны голасна над нівай
Пераліваюцца, плывуць.

Усё ў тым краі сэрцу міла,
Бо я люблю край родны мой,
Дзе з першым шчасцем я спазналась
І з гора першаю слязой.

**Беларусачка**

Я гляджу на твае косы русыя -
Не магу наглядзецца ніяк,
Беларусачка, беларусачка,
Дарагая сяброўка мая.

У краях невядомых, нязведанных,
Буду ў радасці я, ці ў журбе,
Беларусачка, беларусачка,
Не забуду ніколі цябе.

Я вярнуся к табе, сінявокая,
Калі ў кветкі адзенецца край,
Беларусачка, беларусачка,
Ты хоць зрэдку мяне ўспамінай.

## Цячэ вада ў ярок

Цячэ вада ў ярок, цячэ вада ў ярок,
Кладачку занясло.
Кладачка тоненька, вада халодненька,
А я малодзенька.

Вочы мае чарны, вочы мае чарны,
Чаго вы косіце?
Бо яго тут няма, бо яго тут няма,
Каго вы любіце.
Бо яго тут няма,

Іванка не прыйшоў, Іванка не прыйшоў,
Я да яго пайду.
Вадзіцы з крыніцы, вадзіцы з крыніцы
Яму я аднясу.

Вады піць не буду, вады піць не буду,
Вадзіца халодна.
Люблю Марусю я, люблю Марусю я,
Маруся – суджана.

Цячэ вада ў ярок, цячэ вада ў ярок,
Кладачку занясло.
Кладачка тоненька, вада халодненька,
А я малодзенька.

**Гарэла сосна, палала**

Гарэла сосна, палала
Гарэла сосна, палала,
пад ёю дзеўка стаяла,
Пад ёю дзеўка стаяла

Пад ёю дзеўка стаяла
Пад ёю дзеўка стаяла,
русыя косы часала,
Русыя косы часала

Ой, косы, косы вы мае
Ой, косы, косы вы мае,
доўга служылі да вы мне,
Доўга служылі да вы мне

Боляй служыць ня будзеце
Боляй служыць ня будзеце,
пад белый вянок пойдзяце,
Пад белый вянок пойдзяце

Пад белый вянок, пад вянец
Пад белый вянок, пад вянец,
болей не пойдзеш у танец,
Болей не пойдзеш у танец

Пад белый вянок з кольцамі
Пад белый вянок з кольцамі,

болей не пойдзеш з хлопцамі,
Болей не пойдзеш з хлопцамі

Пад белый вянок з ружамі
Пад белый вянок з ружамі,
будзеш дзеўка жамужняя
Будзеш дзеўка жамужняя

Згарэла сосна, да й хутка
Згарэла сосна, да й хутка,
пакрыла косы да й хустка
Пакрыла косы да й хустка

Гарэла сосна, палаў гай
Гарэла сосна, палаў гай,
забралі дзеўку ў дальні край
Забралі дзеўку ў дальні край

Гарэла сосна, палала
Гарэла сосна, палала,
пад ёю дзеўка стаяла,
Пад ёю дзеўка стаяла

## Касіў Ясь канюшыну

Касіў Ясь канюшыну,
Пaглядаў на дзяўчыну.

А дзяўчына жыто жала,
Ды на Яся паглядала.

- Ці ты Ясь, ці ты не,
Спадабаўся ты мне!

Кінуў Яська касіць,
Стаў ён мамку прасіць:

- Люба мамка мая,
Ажаніжь ты мяне.

Усе людзі жонак маюць,
Абнімаюць і кахаюць.

Каб я жоначку маў,
Я б ня піў і не еў.

- Так бяры Станіславу,
Што б сядзела на ўсю лаву!

- Станіславу не хачу,
Бо на лаву не ўсажу.

- Так бяры вунь Яніну,
Працавітую дзяўчыну!

## **Колькі ў небе зор**

Колькі ў небе зор — цяжка палічыць,
Толькі з іх адна найярчэй гарыць.
Гэта ты мая, зорка ясная,
Ты, любоў мая непагасная.

У працы і ў жыцці добра нам з табой
Марыць і любіць з песняй маладой.
Сонца і вясна, навакол прастор,
Шчасця больш у нас, як на небе зор.

Край шырокі наш, мірны, дарагі,
І бягуць удаль светлыя шляхі.
Мне з табой па іх хочацца ісці
І дзяліць усё разам у жыцці.

## Ой, ляцел гусі з броду

Ой, ляцел гусі з броду,
Скалацілі ў рэчцы воду.

Пакуль вада чыста стала,
Я з Раманам пастаяла.

Як стаў Раман жартаваці,
З вёдзер воду выліваці.

- Раман, Раман, Раманіку,
Пусці мяне да доміку.

Я не родну маму маю,
Будзе біці - добра знаю.

Не так біці, як караці
І шэльмаю называці:

- Дзе ж ты, шэльма, валачылась,
Што вячэра ўжо зварылась.

- Цяпер, мама, прызнаюся,
Што з Раманам кахаюся.

Ён высокі, а я нізка,
Будзе ў нас радзіма блізка.

Ён багаты, а я бедна,
Будзе пара адпаведна.

Ён чарнявы - я бялява,
Будзе пара кучарава.

**Толькі з табою**

Толькі з табою мне хочацца быць,
Толькі з табою,
Радасць і шчасце з табою дзяліць
Толькі з табою.
Ранняй часінай к табе я лячу,
Позняй парою.
Толькі к табе прыхіліцца хачу
Сэрцам, душою.
Выйсці у поле, дзе нівы шумяць,
Там, за ракою.
Першую зорку на небе спаткаць
Толькі з табою.
Гэтак не страшны цяжкія пуці
Будуць з табою,
Гэтак ісці неразлучна ў жыцці
Толькі з табою.

## Ты казала ў панядзелак

Ты казала ў панядзелак:
Пойдзем разам з пасядзелак.
Я прыйшоў - цябе няма,
Падманула, падвяла.

Ты ж мяне падманула,
Ты ж мяне падвяла,
Ты ж мяне маладога,
З ума-розуму звяла.

Я ж цябе, я ж цябе падманула,
Я ж цябе, я ж цябе падвяла,
Я ж цябе, маладога,
З ума розуму звяла.

Ты казала ў аўторак:
Пацалуеш разоў сорак.
Я прыйшоў - цябе няма,
Падманула, падвяла.

Ты ж мяне падманула,
Ты ж мяне падвяла,
Ты ж мяне маладога,
З ума-розуму звяла.

Я ж цябе, я ж цябе падманула,
Я ж цябе, я ж цябе падвяла,

Я ж цябе, маладога,
З ума розуму звяла.

Ты казала ў сярэду:
Пойдзем разам на бяседу.
Я прыйшоў - цябе няма,
Падманула, падвяла.

Я ж цябе, я ж цябе падманула,
Я ж цябе, я ж цябе падвяла,
Я ж цябе, маладога,
З ума розуму звяла.

Ты казала ў чацьвер:
Пойдзем разам на канцэрт.
Я прыйшоў - цябе няма,
Падманула, падвяла.

Я ж цябе, я ж цябе падманула,
Я ж цябе, я ж цябе падвяла,
Я ж цябе, маладога,
З ума розуму звяла.

Ты казала ў пятніцу:
Пойдзем разам у сьвятліцу.
Я прыйшоў - цябе няма,
Падманула, падвяла.

Ты ж мяне падманула,
Ты ж мяне падвяла,
Ты ж мяне маладога,
З ума-розуму звяла.

Я ж цябе, я ж цябе падманула,
Я ж цябе, я ж цябе падвяла,
Я ж цябе, маладога,
З ума розуму звяла.

Ты казала ў суботу:
Пойдзем разам на работу.
Я прыйшоў - цябе няма,
Падманула, падвяла.

Я ж цябе, я ж цябе падманула,
Я ж цябе, я ж цябе падвяла,
Я ж цябе, маладога,
З ума розуму звяла.

Ты казала ў нядзелю:
Пойдзем разам на вясельле.
Я прыйшоў - цябе няма,
Падманула, падвяла.

Ты ж мяне падманула,
Ты ж мяне падвяла,

Ты ж мяне маладога,
З ума-розуму звяла.

Я ж цябе, я ж цябе падманула,
Я ж цябе, я ж цябе падвяла,
Я ж цябе, маладога,
З ума розуму звяла.

Ты казала, што памру.
Я зрабіў табе труну.
Я прыйшоў, а ты жыва:
Падманула-падвяла.

Ты ж мяне падманула,
Ты ж мяне падвяла,
Ты ж мяне маладога,
З ума-розуму звяла.

Я ж цябе, я ж цябе падманула,
Я ж цябе, я ж цябе падвяла,
Я ж цябе, маладога,
З ума розуму звяла.

Ты ж мяне падманула,
Ты ж мяне падвяла,
Ты ж мяне маладога,
З ума-розуму звяла.

## Вы шуміце, бярозы

Вы шуміце, шуміце
нада мною, бярозы,
калышыце, люляйце
свой напеў векавы;
а я лягу, прылягу
край гасцінца старога,
на духмяным пракосе
недаспелай травы.

А я лягу, прылягу
край гасцінца старога,
галавой на пагорак,
на высокі курган,
а стамлёныя рукі
вольна ўшыркі раскіну,
а нагамі – ў даліну,
хай накрые туман.

Вы шуміце, шуміце
нада мною, бярозы,
асыпайце, мілуйце
ціхай ласкай зямлю;
а я лягу, прылягу
край гасцінца старога,
я здарожыўся трохі,
я хвілінку пасплю.

## Вяне рута

Вяне рута ля прысадаў:
Чарнявая дзяўчыненька –
Мне дасада!*
І не піў бы, і не еў бы, –
Да чарнявае дзяўчына
Паляцеў бы!
Паляцеў бы, ды не мушу:
Распаліла, чарнявая,
Сэрца, душу.
Ці ты п'ян быў, ці змыліўся,
Што ў такую некрасівую
Улюбіўся?
Я не п'ян быў, не змыліўся:
У дзявочы ясны вочы
Улюбіўся!

## Несе Галя воду

Несе Галя воду,
Коромисло гнеться,
За нею Іванко,
Як барвінок в'ється.

— Галю ж моя, Галю,
Дай води напиться.
Ти така хороша —
Дай хоть подивиться!

— Вода у криниці,
Піди та й напийся,
Я буду в садочку —
Прийди подивися.

— Прийшов у садочок,
Зозуля кувала.
А ти ж мене, Галю,
Та й не шанувала.

— Стелися, барвінку, —
Буду поливати,
Вертайся, Іванку, —
Буду шанувати.

— Скільки не стелився,
Ти не поливала,

Скільки не вертався,
Ти не шанувала.

**Рэчанька**
Ой, рэчанька, рэчанька,
Чаму ж ты не поўлная?
Ой, люлі, люлі, люлі,
Чаму ж ты не поўная?

Чаму ж ты не поўная,
З беражком не роўная?
Ой, люлі, люлі, люлі,
З беражком не роўная?

А як жа мне поўнай быць,
З беражкамі роўнай плыць?
Ой, люлі, люлі, люлі,
З беражкамі роўнай плыть?

Янка коніка паіў,
Маня воду чэрпала.
Ой, люлі, люлі, люлі,
Маня воду чэрпала.

**Палюбіла я яго**

Палюбіла я яго, маладога цыгана,
Кудры чорныя ў яго, а вочы шамана
Ой, нэ, нэ, нэ...
Кудры чорныя ў яго, а вочы шамана
Прыяжджае да мяне, із каня зсядае
Гавары душа мая, хочаш пагадаем
Ой, нэ, нэ, нэ...
Гавары душа мая, хочаш пагадаем

Яго руку ўзяла, карту разлажыла
І любоў яна сваю яму варажыла
Ой, нэ, нэ, нэ...
І любоў яна сваю яму варажыла
Кася беражком ішла, песьню напявала,
Сваяго Яна – цыгана сэрцам успамінала
Ой, нэ, нэ, нэ...
Сваяго Яна – цыгана сэрцам успамінала

Ой, Ты Яне любы мой, душу разтрывожыў,
Як сустрэцца мне з Табой, хто нам дапаможа
Ой, нэ, нэ, нэ...
Як сустрэцца мне з Табой, хто нам дапаможа
Слухаў, слухаў песьню Ян, сэрца не стрымала,
На спатканне выйшаў Ян, Кася цалавала
Ой, нэ, нэ, нэ...
На спатканне выйшаў Ян, Кася цалавала

**Туман ярам**

Туман ярам, ярам-даліною,
Туман ярам, ярам-даліною.
За туманам нічога не відна,
Толькі відна дуба зеляногa.

Пад тым дубам крыніца стаяла,
Там дзяўчына воду набірала.
Ды ўтапіла залато вядзерца,
Засмуціла казакова сэрца.

— А хто ж тое вядзерца дастане,
Той са мною на ручніку стане.
Хлопец тое вядзерца дастане,
Ён з табою на ручніку стане.

**Пагоня**

Толькі ў сэрцы трывожным пачую
За краіну радзімую жах,
Успомню Вострую Браму святую
І ваякаў на грозных канях.

У белай пене праносяцца коні,
Рвуцца, мкнуцца і цяжка хрыпяць,
Старадаўняй Літоўскай Пагоні
Не разбіць, не спыніць, не стрымаць!

У бязмерную даль вы ляціце,
А за вамі, прад вамі — гады.
Вы за кім у пагоню спяшыце?
Дзе шляхі вашы йдуць і куды?

Мо яны, Беларусь, панясліся
За тваімі дзяцьмі наўздагон,
Што забылі цябе, адракліся,
Прадалі і аддалі ў палон?

Біце ў сэрцы іх — біце мячамі,
Не давайце чужынцамі быць!
Хай пачуюць, як сэрца начамі
Аб радзімай старонцы баліць.

Маці родная, Маці-Краіна!
Не ўсцішыцца гэтакі боль.

Ты прабач, ты прымі свайго сына,
За Цябе яму ўмерці дазволь!

Ўсё лятуць і лятуць тыя коні,
Срэбнай збруяй далёка грымяць…
Старадаўняй Літоўскай Пагоні
Не разбіць, не спыніць, не стрымаць.

## Купалінка

Купалінка-купалінка, цёмная ночка,
Цёмная ночка, а дзе ж твая дочка,
Цёмная ночка, а дзе ж твая дочка.

Мая дочка ў садочку ружу, ружу поліць,
Ружу, ружу поліць, белы ручкі коліць,
Ружу, ружу поліць, белы ручкі коліць.

Кветачкі рвець, кветачкі рвець,
Вяночкі звівае,
Вяночкі звівае, слёзкі пралівае,
Вяночкі звівае, слёзкі пралівае.

Купалінка-купалінка, цёмная ночка,
Цёмная ночка, а дзе ж твая дочка,
Цёмная ночка, а дзе ж твая дочка.

## Бывайце здаровы

Бывайце здаровы,
Жывіце багата,
Ужо ж мы паедзем
Да сваёй хаты.
Ў зялёнай дураве
Мы начаваць будзем.
Эх! Вашае ласкі
Вавек не забудзем.

У вашым калгасе
Шырокае поле,
Няхай жа на шчасце
Цвіце ваша доля.
На рэчках на вашых
Бурлілі бы воды,
Каб плавалі з крыкам
Гусей карагоды.

Каб жыта у полі
Трубою вілося,
Каб сала у хаце
Кублamі вялося.
Штодзень у капусце
Каб плавала скварка,
А к скварцы часінай
Вялася б і чарка.

Яшчэ вам жадаем
Прыбытку у хаце -
Не мала, не многа -
Штогод па дзіцяці.
Не будзе вам крыўды
Яшчэ і за тое,
Калі пашанцуе
На год і па двое.

Бывайце здаровы,
Жывіце багата,
А мы ад’язджаем
Дадому, дахаты.

**Ой, у лузе пры даліне**

Ой, у лузе пры даліне,
Разцвіла каліна
Там дзяўчына воду брала
Файна, чорнабрыва.

Яна брала, яна брала,
Яшчэ набірала.
Адна дочка ў маці былы,
Ды загаравала.

Бацька добры, бацька добры,
А маці ліхая,
Не пускае ў сад гуляці
Кажа маладая.

Пусці маці пагуляці,
Яй не забаўлюся
Як запяе першы певень
Да дому вярнуся

Пяе певень, пяе другі,
А кура сакоча.
Кліча маці вечараці
А дачка не хоча.

Вечарайце бацька й маці,
Вечарайце самі,
Бо ўжо мне надаела
Вечараці з вамі.

Ой, у лузе пры даліне,
Разцвіла каліна
Там дзяўчына воду брала
Файна, чорнабрыва.

Projekt współfinansowany w
ramach programu Unii Europejskiej
Erasmus+

